# *Як утварылася Ліхоўскае возера?*











*Знаходзіцца гэтае возера за мястэчкам Пескі, у густым-густым лесе, па дарозе на Асаўляны. Само па сабе возера топкае, вельмі глыбокае, зарослае трыснягом, адным словам - недаступнае. Як ты да яго ні імкніся, а ўсё роўна не дабярэшся. Стваралася ўражанне, што гэты вадаём некалі і ўзнік менавіта для таго, каб да яго ніхто не мог дабрацца. Сцвярджаюць, што і гісторыя, якая сведчыць аб паходжанні назвы «Ліхоўскае», - таксама не вельмі радасная. Калі ж гаварыць больш дакладна, дык сумная.*

*У незапамятныя часы, кажуць, на месцы гэтага возера стаяла вялікая і багатая вёска Ляхавічы. Вяскоўцы заўсёды мелі ўсё сваё, як гавораць, і хлеб, і да хлеба, бо былі заможнымі, ніколі не ведалі, што такое голад ды нястача. Некаторыя нават сцвярджалі, што тубыльцы жылі ў сапраўднай раскошы.*

*Жыў там ці не адзін з самых багатых гаспадароў. Сям'ю меў невялікую: сам з жонкай ды яшчэ дачка-прыгажуня. Звалі яе Поля. Дзяўчына была працавітая і руплівая, бы тая пчолка. Хоць у раскошы расла, але была спагадлівая ды чуллівая да чужой бяды. А як яна спявала... Гэта ж трэба, каб усе гэтыя якасці ўвасобіліся ў адным чалавеку. Пра Полю гаварылі ўсё толькі самае лепшае. Ніхто ніколі на яе нават скрыва не паглядзеў, не тое што слова благое сказаў. Калі і глядзелі, дык з замілаваннем ды радасцю. Усё ў жыцці ідзе не заўсёды так, як мае быць. Так і тут. Надышла часіна, калі саладка заныла ў грудзях, часцей застукала сэрца — закахалася яна. І нічога тут супраць не зробіш. Але бяда ў тым, што хлопец - Пятрок - быў не надта багатым. Жыў ён у суседняй вёсцы, з ранняга дзяцінства страціў бацьку, гараваў сам-адзін з матуляй. Як ні рваліся, як ні імкнуліся, а ўсё роўна з беднаты адною шчыраю працаю вырвацца не здолелі. Калі даведаўся бацька прыгажуні, з кім яна кахаецца, то адразу ж запэўніў катэгарычна:*

*– За гэтага галяка не аддам! Мала што кахаеш... Галоўнае грошы, а ўсё астатняе - драбяза... Не бедная ты. Такі пасаг за табою далі, што іншыя ажно ахнуць... Вось яны і падбіраюцца да цябе... А ты ўсё пра сваё каханне заладзіла...*

*Дачка горка плакала ды ўсё прасіла. Тады бацька вырашыў схітраваць паабяцаўшы:*

*– Добра, выйдзеш ты за яго замуж, тольні няхай ён спачатку разбагацее.*

*Сказаў так і ўсміхнуўся сам сабе, бо які ж дурань паверыць, што ўсяго за які тыдзень можна нажыць вялікае багацце. Гады для гэтага трэба - па сабе ведае. Поля, засмучоная і прыбітая горам, пра ўсё чыста распавяла Петраку. Выгаварылася і заплакала: «*

*– Сказаў, што праз тыдзень стане сватоў ад багатых вяскоўцаў чакаць. Пабедавалі-пагаравалі ды і разышліся, каб заўтра зноў сустрэцца і абмеркаваць тое, што за ноч прыдумалі.*

*Пятрок вырашыў дзейнічаць. Успомніў, што на ягоную старую суседку ўсе чыста людзі гаманілі, быццам яна надзвычай моцная варажбітка. Вырашыў пашукаць у яе якой-небудзь рады.*

*Тым болей і што заўсёды старой дапамагаў, калі ў той надаралася якая патрэба. Выслухала ўважліва чараўніца хлапчыну памеркавала хвіліну-другую і кажа:*

*– Надта дапамагчы не змагу, але падкажу, як за такі кароткі тэрмін можна ўзбагаціцца. Слухай уважліва, каб нічога, выпадкам, не пераманіў, бо тады адразу сваім жыццём расплацішся. Ты ж перад самым Купаллем да мяне прыйшоў. А ў гэтую ноч некаму абавязкова шанцуе. Толькі тут ёсць адна закавыка: хто ўзбагачаецца такім шляхам, знаходзіцца ў непасрэднай сувязі з нячыстай сілай.*

*– Я не жадаю запрадаваць сваю душу, - катэгарычна запярэчыў Пятрок.*

*– Малайчына, што так разважаеш. Апошняя гэта справа - гандляваць душою. На мяне вунь чаго толькі не гавораць, а я ж нічога благога нікому не зрабіла не толькі на справе, але нават у думках не падумала.*

*Спачатку дачакайся, пакуль добра разгарыцца купальскае вогнішча, ды затым непрыкметна ад гурта і збяжы. Прабірайся і сачы, каб цябе ніхто не бачыў, бо тады нічога не атрымаецца. Ідзі прама на воўчую выспу. Там жа і расце густым-густы папаратнік. У ім шукай кветачку. Знайсці яе даволі проста: калі станеш паблізу хадзіць, кветка будзе гарэць заклікальным агнём. Хто яе знойдзе, той адразу ж становіцца надзвычай багатым. Ён здольны будзе завалодаць такімі скарбамі, якія нікому іншаму і не сніліся...*

*Калі знойдзеш кветку, то ідзі дамоў толькі напрасткі. Хай сабе там ззаду хоць грыміць, трашчыць, скуголіць, нешта палохае ці вые несваім голасам, але ты ўсё роўна цярпі і не аглядвайся. Бо, калі азірнешся, знойдзеш верную смерць.*

*Скарбы гэтыя, чалавеча, заклятыя і запроста так нікому не даюцца. Дорага яны каштуюць. Таму і папярэджваю цябе шчыра, каб ў любым выпадку асцерагаўся, бо можа здарыцца непапраўнае.*

*Падзякаваў Пятрок варажбітцы і пабег шчаслівы, нібы на крылах паляцеў. З'явілася ў яго надзея на добры зыход справы. Нават смяротная небяспека не палохала.*

*Хлопцу на самай справе пашанцавала. Выбіўся ён на воўчую выспу і знайшоў тую кветку, якую мільёны людзей марна шукаюць. Узрадаваўся, ажно засвяціўся ўвесь. Ад гэтай радасці забыўся нават пра перасцерагальныя словы чараўніцы - павярнуўся на нейкі гул... Так і скамянеў.*

*А навокал возера разлілося. Яго назвалі Ліхоўскім, што вызначае яго паходжанне ад ліхой, нячыстай сілы.*